*УДК [61+615.1](06)(043.2)*
*ББК 5+52.81*
*А 43*
*ISBN 978-985-21-1569-8*



***Піхцерава В. Ю.***

# РАМОНАК У БЕЛАРУСКАЙ І КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Носік А. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Аналіз падабенстваў і адрозненняў у беларускай і кітайскай традыцыйных культурах у кантэксце медыцыны ў наш час з’яўляецца вельмі актуальным. Фітатэрапія здаўна служыла шматлікім лячэбным мэтам, таму заўсёды мела сваіх прыхільнікаў.

Рамонак – (лац. Matricaria chamomilla, кіт. 洋甘菊) аднагадовая або шматгадовая расліна, якая адносіцца да сямейства складанакветных, з’яўляецца адной з самых папулярных і шырока распаўсюджаных лекавых раслін у народнай медыцыне беларусаў і кітайцаў. За доўгую гісторыю традыцыйнай медыцыны вопытным шляхам былі вылучаны шматлікія гаючыя ўласцівасці кветкі. У сувязі з мадэрнізацыяй вёсак сучасная грамадскасць ўсё менш і менш увагі надае раслінам, якія даносяцца да народнай медыцыны, аднак гэтага нельга сказаць пра рамонак – яго выкарыстоўвае ледзь не кожны з нас і сёння.

Этнаграфічныя даследаванні сведчаць, што расліна таксама выкарыстоўвалася ў вянках на розныя святы, вяселле, для ўпрыгожвання двароў пасля асвячэння ў царкве. Лічылася, што цудадзейную лекавую моц мае “купальскі збор”, бо ўвасабляе сукупную энергію раслiннага свету. Сярод купальскіх зёлак абавязкова прысутнічаў рамонак, што магло быць абумоўлена цэнтральнай фазай яго цвіцення у гэты час. На Іванаў дзень маленькім дзецям апраналі вянкі з рамонкаў, звязваючы колер іх сярэдзінак з сонцам. Акрамя таго, нашы продкі праводзілі варажбу на рамонках па пялёстках (“кахае – не кахае”), вядомую ўсім яшчэ з дзяцінства.

У сваю чаргу ў кітайскай міфалогіі M. chamomilla набывае сваё асаблівае значэнне. У кітайскім фальклоры рамонак згадваецца як сродак пазбаўлення ад энергіі Інь, злых духаў і зданяў, таму ён часта сімвалізаваў загадкавасць, а таксама адзіноту і развітанне. Тым не менш, з цягам часу кветка набыла значэнне чысціні і нявіннасці. Патаемныя прыхільнікі ўручалі рамонкі, каб паказаць прыхільнасць, захаваную глыбока ў сэрцы.

У адрозненне ад міфапаэтычнага ўспрымання рамонкаў беларусамі і кітайцамі, продкі прадстаўленых народаў вынайшлі шмат агульных лячэбных уласцівасцей расліны. Для лячэння расліну ўжываюць унутр і вонкава ў якасці адвараў, настояў і ў беларускай, і ў кітайскай народнай медыцыне. Валодаючы шырокім спектрам злучэнняў, рамонак праяўляе розную фармакалагічную актыўнасць (заспакаяльную, супрацьзапаленчую, супрацьалергічную), таму прымяняецца для лячэння захворванняў многіх сістэм арганізма. Нашы продкі называлі рамонак матачнікам, бо лячылі з дапамогай яго органы жаночай палавой сістэмы. Напрыклад, “Кітайская фітатэрапія. Уйгурская медыцына” (《中华草本.维药卷》) адзначае, што рамонкавыя адвары паляпшаюць працу мочапалавой сістэмы.

Такім чынам, Matricaria chamomilla адрозніваецца сімвалізмам у міфалогіі Беларусі і Кітая, аднак медыцынскае прымяненне дэманструе шмат агульнага. На еўрапейскай тэрыторыі для тэрапіі выкарыстоўваліся пераважна кветкавыя галоўкі рамонка, у той час як ва ўсходняй медыцыне – цэлая расліна. Адрозненні ў выкарыстанні рамонкаў у народнай медыцыне беларусаў і кітайцаў абумоўлены асаблівасцямі этнакультурнага развіцця двух народаў.